У ДОБРЫ ШЛЯХ ПА МОСЦЕ!

У Брэсце ўрачыста адкрылі Кобрынскі пуцеправод

У Дзень Незалежнасці шмат людзей сабралася каля Кобрынскага моста. Ён ужо два месяцы дзейнічаў напоўніцу, па ім у абодва бакі хадзіў транспарт, але да гэтага дня працягвалася добраўпарадкаванне. Ды і момант адкрыцця стаў свайго роду падвядзеннем вынікаў вялікай работы, якая доўжылася больш за два гады.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Кобрынскі пуцеправод — не проста адзін з гарадскіх мастоў. Ён у пэўным сэнсе галоўны мост у горадзе. Ён злучае ўсходнюю частку — вуліцу Маскоўскую, якая плаўна пераходзіць у трасу М1, — з заходняй і цэнтральнай. Турысты, госці горада, якія накіроўваюцца ў крэпасць, абавязкова праязджаюць па мосце. Шлях большай часткі гараджан, што жывуць у спальных раёнах Усход, Кавалёва, іншых мікрараёнах, штодня праходзіць праз названы пуцеправод. Ужо трыццаць гадоў аўтар гэтых радкоў ездзіць на работу праз Кобрынскі мост. Дом друку ў Брэсце знаходзіцца зусім побач з мостам, яго відаць з акон нашых рабочых кабінетаў. А паколькі у працэсе рэканструкцыі мост пашырылі, то ён стаў бліжэйшым да нас у прамым сэнсе. Так што адкрыццё пуцеправода — сапраўды падзея для нас, многіх і многіх гараджан, а не толькі адно з мерапрыемстваў у рамках святкавання тысячагоддзя.

Кобрынскі пуцеправод упершыню быў узведзены прыкладна сто гадоў таму. За стагоддзе ён перажыў некалькі рэканструкцый. Цяпер яго цалкам знеслі і перабудавалі наноў. Праўда, зносілі часткамі, каб не перакрываць рух цалкам на такой важнай дарозе. І сёння трэба сказаць слова пахвалы дарожнікам, будаўнікам, інжынерам, якія сумелі правесці такую гіганцкую работу з мінімальнымі нязручнасцямі. Напрыклад, перад пачаткам будоўлі гаварылася пра тое, што адна паласа пэўны час будзе адкрыта толькі для грамадскага транспарту. Але за ўвесь час работы так і не перакрывалі рух для іншых машын нават на дзень.

Дарожнікі працавалі ў холад, дождж і спёку. Увесь чэрвень Брэст літаральна млеў ад пякельнага сонца. Скажам, яшчэ за два дні да ўрачыстага адкрыцця каля чацвёртай вечара, калі тэмпература паднялася пад сорак, асфальт і бетон патыхалі гарачынёй, выпраменьвалі яе так, што хацелася хутчэй прабегчы і схавацца ў цень, рабочыя працавалі. І такіх дзён было нямала. Так што гэта было найперш іх свята, тых, чыімі рукамі і мазгамі гэты прыгожы мост стаў рэальнасцю.

Новы мост узвялі для брастаўчан работнікі ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 4 Брэста». Яго **генеральны дырэктар Ігар ШУГАЕЎ,** уручаючы сімвалічны ключ кіраўніку Брэсцкага ДЭП, адзначыў, што да добрага прывыкаеш хутка, таму, відаць, сёння ўжо шмат хто забыўся, у якім стане знаходзіўся мост да рэканструкцыі. А тут узведзена, па сутнасці, два новыя пуцеправоды, на кожным з якіх маюцца тры паласы руху. З'явіўся падземны пешаходны тунэль, а таксама інфраструктура, якая служыць бяспецы перамяшчэння пешаходаў і транспарту.

Цяпер ужо дарожнікі кажуць, што гэты аб'ект быў вельмі складаны і тым цікавы, бо ўзводзіць яго давялося ў цэнтры горада пры поўнай загрузцы ды інтэнсіўнасці руху. І калі названы трэст выступіў генпадрадчыкам будоўлі, то яго субпадрадчыкамі сталі ААТ «Мостабудаўнічы атрад-58 КУП «Брэстжылбуд», ПКУП «Камунальнік», ТАА «Фактарбуд», філіял ЭМУ-9 ААТ «Белэлектрамантаж». І ўсе папрацавалі так, што **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** назваў іх работу працоўным подзвігам.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС падкрэсліў значнасць мерапрыемства менавіта ў Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, калі на пляцоўку каля моста сабралася вельмі шмат людзей, каб павіншаваць адно аднаго са святам.

Сімвалічную стужку перарэзалі каля ўваходу ў падземны пераход. З гэтага дня ён таксама адкрыты. Там устаноўлены ўказальнікі напрамкаў руху. Маюцца зручнасці для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Будаўніцтва моста абышлося краіне прыблізна ў 20 мільёнаў рублёў. На адкрыцці адзначалі, што яшчэ пяць гадоў таму такая рэканструкцыя выглядала амаль што нязбыўнай марай. Але дзякуючы таму, што аб'ект быў уключаны ў праграму святкавання тысячагоддзя, мара здзейснілася. Цяпер брастаўчанам засталося як след даглядаць мост. І на гэтым шляху зроблены пэўныя крокі. Напрыклад, устаноўлена арыгінальная падсветка, так што ў цёмны час сутак мост будзе выглядаць надзвычай прыгожа. Як заўважыў кіраўнік горада, цяпер вядзецца работа над падсветкай Заходняга абходу, які таксама рыхтуецца да здачы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пашана

МАНУМЕНТ ДЛЯ ДАСТОЙНЫХ

У Гродне адкрылі абласную Дошку гонару

Праект нетыповы. Яго распрацавалі прафесійныя архітэктары інстытута «Гроднаграмадзянпраект». Новы аб'ект можна аднесці да малой архітэктурнай формы. Ён прадстаўлены выявай карты рэгіёна з каляровым гербам і вялікім авалам, на якім размешчаны назвы найлепшых раёнаў, арганізацый, а таксама прозвішчы ганаровых жыхароў.

Лаўрэатамі прэміі «Чалавек года Гродзеншчыны» сталі прадстаўнікі самых розных прафесій, актыўныя грамадскія дзеячы.

— Мы на кожную намінацыю адбіраем да дзясятка кандыдатаў, узважваем усе водгукі, уважліва адсочваем вынікі. Ацэньваецца не толькі праца чалавека як прафесіянала, але і яго ўнёсак у грамадскае жыццё, — падкрэсліў падчас цырымоніі **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**

Сярод раёнаў найлепшымі па выніках абласнога спаборніцтва прызнаны горад Гродна, Гродзенскі, Мастоўскі, Ашмянскі і Смаргонскі раёны. Кожны адметны сваімі дасягненнямі ў адным з кірункаў — прамысловасці, будаўніцтве, сферы гандлю, сацыяльна-культурным развіцці. Таксама на Дошку гонару занесена 20 арганізацый і размешчана 20 партрэтаў жыхароў Гродзеншчыны, якія дасягнулі поспехаў у працы, службе, творчасці, вучобе і спорце. Сярод іх — пераможца конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» Юлія Касталомава з Ваўкавыска, пераможца конкурсу «Урач года Рэспублікі Беларусь» Эла Рында з Ліды, народны майстар Беларусі Станіслава Міхно з Воранаўскага раёна.

Так, напрыклад, Гродзенскі раён прадстаўлены трыма прафесіяналамі, якім прысуджана званне «Чалавек года Гродзеншчыны». Сярод лаўрэатаў — участковы Уладзімір Бахмач, які летась быў прызнаны найлепшым у вобласці па выніках конкурсу прафесійнага майстэрства. У ліку пераможцаў — СВК «Свіслач» Гродзенскага раёна, дзе атрымліваюць самыя высокія ў рэспубліцы ўраджаі і надоі малака. Адзначаны поспехі прамысловых прадпрыемстваў, медыцынскіх і культурных устаноў, прыватных кампаній, грамадскіх арганізацый.

Многіх прадстаўнікоў рэгіёна можна ўбачыць на рэспубліканскай Дошцы гонару ў цэнтры сталіцы, але сваёй пляцоўкі для ўшанавання лепшых у вобласці доўгі час не было. Адметна, што Дошка гонару Гродзеншчыны размешчана каля адноўленай абласной філармоніі. Будынак доўгі час праходзіў рэканструкцыю і быў урачыста адкрыты месяц таму. Цяпер тут гатовы праводзіць любыя мерапрыемствы на самым высокім узроўні. На найбуйнейшай у рэгіёне канцэртнай пляцоўцы прайшоў і вялікі канцэрт, прысвечаны 75-й гадавіне вызвалення Беларусі. Ён адбыўся адразу пасля ўрачыстага адкрыцця Дошкі гонару з удзелам ветэранаў і кіраўніцтва рэгіёна.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота «Гродзенская праўда».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Шайгу назваў асноўную прычыну аварыі на глыбакаводным апараце

Пажар у акумулятарным адсеку стаў асноўнай прычынай надзвычайнага здарэння з глыбакаводным апаратам, у выніку якога загінулі 14 падводнікаў. Пра гэта міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу паведаміў прэзідэнту РФ Уладзіміру Пуціну. Па словах міністра, ядзерная энергетычная ўстаноўка на падводным апараце «цалкам ізаляваная і бязлюдная». Ён адзначыў, што экіпаж выканаў «усе неабходныя мерапрыемствы па абароне ўстаноўкі», таму яна знаходзіцца «цалкам у працаздольным стане». Паведамляецца, што падводнікі займаліся вывучэннем прыдоннай прасторы і дна Сусветнага акіяна ў інтарэсах Ваенна-марскога флоту Расіі. Сямёра з загінулых былі капітанамі першага рангу, яшчэ трое — капітанамі другога рангу. У двух з іх былі званні Герояў Расіі. З адсека, ахопленага агнём, у першую чаргу эвакуіравалі грамадзянскага прадстаўніка прамысловасці.

Пасля трохдзённых спрэчак абрана кіраўніцтва ЕС

Пасля трох дзён жорсткіх спрэчак і ўзаемных абвінавачванняў лідары 28 краін ЕС размеркавалі ключавыя пасады ў кіраўніцтве блока. Люксембуржац Жан-Клод Юнкер восенню саступіць месца кіраўніка Еўракамісіі 60-гадовай немцы Урсуле фон дэр Ляен, даўняму паплечніку канцлера Ангелы Меркель і першай жанчыне на пасадзе міністра абароны Германіі. Пасада старшыні Еўрапейскага цэнтральнага банка адыдзе другой найбуйнейшай краіне блока — Францыі. Італьянец Марыа Драгі перадасць яго 63-гадовай старшыні Міжнароднага валютнага фонду Крысцін Лагард. Паляка Дональда Туска на чале Еўрапейскага савета зменіць 43-гадовы бельгійскі прэм'ер Шарль Мішэль. А за знешнюю палітыку ЕС замест італьянкі Федэрыка Магерыні будзе адказваць 72-гадовы міністр замежных спраў Іспаніі, сацыяліст Жазэп Барэль. Новым старшынёй Еўрапейскага парламента абраны італьянец Давід-Марыя Сасолі.

Пясец прабег тры з паловай тысячы кіламетраў

Маладая палярная лісіца перамясцілася з усходняга ўзбярэжжа нарвежскага архіпелага Шпіцберген на канадскі востраў Элсмір за два з паловай месяцы, пераадолеўшы больш за 3500 кіламетраў, чым выклікала глыбокае здзіўленне заолагаў. Даследчыкі з нарвежскага Палярнага інстытута замацавалі на целе маладой самкі палярнай лісіцы прыладу GPS-сачэння і ў канцы сакавіка мінулага года выпусцілі яе на волю на ўсходнім узбярэжжы галоўнага вострава архіпелага Шпіцберген. Лісе было менш за год, калі яна адправілася на захад у пошуках ежы, дасягнуўшы Грэнландыі ўсяго праз 21 дзень пасля старту і пераадолеўшы 1512 кіламетраў. Далей лісіца прыступіла да другога этапу вялікага падарожжа, і натуралісты заўважылі яе ўжо на канадскім востраве Элсмір — яшчэ на дзве тысячы кіламетраў на захад — усяго праз 76 дзён пасля выхаду са Шпіцбергена.

НА СУВЯЗІ З УЛАДАЙ

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 6 ліпеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 правядуць:

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.